3. Прохоров, А. А. Космология создания города в мифологических представлениях восточнославянского язычества // Развитие цивилизации и Новый Свет. Первые Кнорозовские чтения. Материалы научной конференции 20–21 окт. 1999 г. – М., 1999. С. 41 – 43.

4. Lapis B. Rex utilis: kryteria oceny władców germańskich we wczesnym średniowieczu (od połowy V do początku VIII wieku). – Poznań, 1986.

5. Descriptio civitatum et regionum ad septentrionalem plagam Danubii sive Geographus Bavarus (Описание городов и областей к северу от Дуная, или Баварский Географ) // Назаренко, А. В. Немецкие латиноязычные источники IX – XI вв. Тексты, перевод, комментарии. – М., 1993.

6. Назаренко, А. В. Комментарии // Назаренко, А. В. Немецкие латиноязычные источники IX – XI вв. Тексты, перевод, комментарии. – М., 1993.

7. Херрман, И. Ruzzi. Forsderen Liudi. Fresiti. К вопросу об исторических и этнографических основах «Баварского Географа» (первая половина IX в.) // Древности славян и Руси. – М., 1988. С. 162–169.

8. Назаренко, А. В. Комментарии // «Баварский географ» // Древняя Русь в свете зарубежных источников: Хрестоматия / Под ред. Т.Н. Джаксон, И.Г. Коноваловой и А.В. Подосинова. Том IV: Западноевропейские источники. Сост. пер. и коммент. А.В. Назаренко. – М., 2010.

9. Гаркави, А. Я. Сказания мусульманских писателей о славянах и русских. – СПб., 1870.

10. Королюк, В. Д. Волыняне Абу-л-Хасана ам-ал-Масуди и «Повести временных лет» // Античная древность и средние века. – Вып. 10, 1973.

11. Новосельцев, А. П. Восточные источники о восточных славянах и Руси VI–IX вв. // Древнерусское государство и его международное значение. –М., 1965.

12. Розен, В. Р. Перевод отрывка 8 по Константинопольской рукописи // Куник А.А., Розен В.Р. Извѣстия ал-Бекри и других авторов о Руси и Славянах (Приложеніе къ XXXII тому записокъ Имп. Академіи наукъ), Ч. I. – СПб., 1878. – С. 46–57.

13. Войтович, Л. Галицько-волинскі етюди. –Біла Церква, 2011.

14. Якубович, М. Волинь у повідомленнях арабського історика аль-Мас'уді: свідчення нових видань оригіналу. Тези виступу на круглому столі, присвяченому 1160-річчю української державності (Острог, 12 вересня 2011 р.) // https://web.archive.org/web/20160808063614/http://salam.org.ua/volin-u-povidomlennyah-arabskogo-is/

15. Ключевский, В. О. Курс русской истории. // Сочинения Т. 1. – М., 1956.

16. Греков, Ю. Д. Древнейшие судьбы Западной Украины // Избранные труды. – М., 1959, Т. 2.

## КУЛЬТАВАЯ ДАХРЫСЦІЯНСКАЯ СКУЛЬПТУРА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ: ДА ПЫТАННЯ ІСНАВАННЯ ВЫЯЎЛЕНЧЫХ КАНОНАЎ

**Д. В. Скварчэўскі**

Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, zmicerbelapol@inbox.ru

Артыкул прысвечаны разгляду культавай дахрысціянскай скульптуры (ідалаў), якія былі знойдзены на тэрыторыі Беларусі. Аўтар вызначае асноўныя выяўленчыя асаблівасці, удакладняецца класіфікацыя ідалаў, выяўленых на беларускіх землях. Асобная ўвага надаецца дыскусійнаму пытанню суадносінаў каменных хрысціянскіх крыжоў і паганскіх ідалаў. Аўтарам прапанавана

вылучыць крыжападобную антрапаморфную скульптуру ў якасці асобнага віда ідалаў, які мог узнікнуць пад уплывам хрысціянізацыі і з'яўляецца сведчаннем узаемапранікнення і адаптацый традыцый. На падставе вылучаных характарыстык аўтар разважае пра магчымасць існавання выяўленчых канонаў культавай паганскай скульптуры на тэрыторыі Беларусі і іх асаблівасцяў.

*Ключавыя словы:* ідалы; скульптура; паганства; міфалогія.

Pre-Christian cult sculpture from the territory of Belarus is described in this paper. The author identifies the main art features, clarifies the classification of idols found in Belarus. Particular attention is paid to the issue of the relationship between stone christian crosses and pagan idols. Anthropomorphic cruciform sculpture should be differentiated as a separate type of idols. This type could have arisen under the influence of christianization and testifies to the interpenetration and adaptation of traditions. The author discusses about the possibility of the existence of art canons of cult pagan sculpture in Belarus and their features.

*Keywords:* idols; sculpture; paganism; mythology.

Культавая дахрысціянскай скульптура на тэрыторыі Беларусі разглядалася як у асобных публікацыях, прысвечаных знаходкам канкрэтных артэфактаў, так і ў шэрагу абагульняючых артыкулаў [3; 5; 14], дзе былі апісаны не толькі вядомыя на момант публікацый ідалы, але таксама прапанавана класіфікацыя і ўзняты пытанні атрыбуцыі і стылістычных паралеляў. Украінскі мастацтвазнаўца Расціслаў Забашта адзначаў, што паганская скульптура Беларусі адносіцца да прыбалтыйскага гісторыка-культурнага асяроддзя IX/X – XII/XIII стст. [5, с. 35], аднак таксама на беларускіх землях вядомы знаходкі антрапаморфнай скульптуры, якія адносяцца да ранейшых часоў.

Галоўнай праблемай, якая паўстае падчас вывучэння паганскіх стодаў на тэрыторыі Беларусі, з'яўляецца немагчымасць у большасці выпадкаў дакладнай атрыбуцыі помнікаў. Гэта выклікана перадусім па-за комплекснасцю знаходак і ранейшымі перамяшчэннямі ідалаў. Пэўныя перашкоды таксама стварае недастатковае апісанне навукоўцамі XIX – пач. XX стст. знешняга выгляду стодаў, іх месцазнаходжання, часам ігнараванне даследавання фальклорнай традыцыі, звязанай з ідаламі. Акрамя таго, да сённяшняга дня захавалася даволі абмежаваная колькасць ідалаў, пераважна каменных, што не дазваляе ў поўнай ступені разглядаць традыцыю ідалаў і прасачыць змену стыляў.

Усё пералічанае ўскладняе магчымасці вызначыць час стварэння і шанавання скульптуры, суаднесці стоды з рэлігійнай традыцыяй пэўнага насельніцтва: вызначыць, якому боству яны належаць, да якой культуры адносяцца. Неабходна падкрэсліць, што паганства ў гісторыі Беларусі не было адзінай маналітнай рэлігіяй, як гэта часам стэрэатыпна ўяўляецца. Варта казаць пра паганскія рэлігіі, якія хоць і маюць агульны індаеўрапейскі выток, аднак развіваліся ў розныя гістарычныя перыяды ў розных этнакультурных супольнасцях. Адпаведна, ідалы маглі ствараюца ў розных стылях і тэхніцы. Гэтыя акалічнасці павінен улічваць даследчык, калі робіцца агульная класіфікацыя, вылучаюцца рэгіянальныя і храналагічныя асаблівасці ў стылістыцы культавай дахрысціянскай скульптуры.

Калі разглядаць праблему існавання выяўленчага канона дахрысціянскай скульптуры на тэрыторыі Беларусі, то нельга не адзначыць той факт, што на дадзены момант фактычна невядомы знаходкі аднолькавых ідалаў. Магчыма пакуль вылучыць групу тыпалагічна падобных жаночых стодаў, якая вельмі выразна

адрозніваецца ад усіх іншых. Гэта, з аднаго боку, сведчыць пра адсутнасць адзінага выяўленчага канона, а з іншага – пра патэнцыйнае існаванне лакальных выяўленчых асаблівасцяў у кожнай з культур ад каменнага веку да сярэднявечча, аднак гэта патрабуе свайго пацверджання новымі знаходкамі, якія будуць выяўляць падабенства з іншымі вядомымі ідаламі.

Нягледзячы на ўсе адзначаныя акалічнасці, тым не менш можна вызначыць некаторыя характэрныя рысы ідалаў, якія дазваляюць казаць пра існаванне пэўных выяўленчых правілаў стварэння культавай скульптуры.

Да найбольш старажытных знаходак антрапаморфных скульптур, якімі, імаверна, мелі культавае прызначэнне, даследчыкі адносяць невялікія выявы, знойдзеныя на паселішчы Асавец-2 у Бешанковіцкім р-не, якія адносяцца да позняга неаліту/ранняга бронзавага веку (Усвяцкая археалагічная культура). Адна статуэтка была выразана з цвёрдага лісцёвага дрэва і мае цёмна-шэры колер, што выклікана, магчыма, націраннем адпаведным фарбавальнікам. Выява ўяўляе галаву мужчыны з выразнымі і рэзка акрэсленымі рысамі твару. Ніжняя частка знаходкі абламаная. Даўжыня захаванай на сёння часткі 9.5 см. Другая фігурка ўяўляе сабой адламаную галоўку статуэткі з рогу даўжынёй 4.2 см. Гэта зноў жа вобраз мужчыны з вострай барадой, прамым носам, высокім ілбом і глыбокімі высвідраванымі вачніцамі. Вусны тонкія, сфармаваныя папярэчнай нарэзкай. На шыі каля самой асновы галавы прасвідравана адтуліна, што сведчыць пра тое, што рэч да нечага падвешвалася. Параўнанне статуэтак паказвае іх індывідуальнасць. Выконваючы пэўнае рытуальнае прызначэнне, яны ў той жа час перадаюць, несумненна, еўрапеоідныя вобразы жыхароў наваколля колішняга Крывінскага возера [1, с. 325–326].

Важна тое, што гэтая знаходка мае прамы адпаведнік, на які ў раней не звярталі ўвагу. Яшчэ ў 1976 г. на былым свайным паселішчы каля в. Дзяздзіца Пскоўскай вобласці, недалёка ад сучаснай беларускай мяжы, быў выяўлены фрагмент трубчатай косткі з выявамі твараў, адзін з якіх захаваўся цалкам, а ад другога ёсць толькі ніжняя частка. Знаходку папярэдне датавалі другой паловай III тыс. да н.э. [2, с. 7]. Адметна тое, што твар з Дзяздзіцы адпавядае знаходцы касцяной галавы з Асаўца. Гэты прыклад яскрава сведчыць пра тое, што ў межах адной археалагічнай культуры сапраўды існаваў адзіны выяўленчы канон ў дачыненні да антрапаморфных выяў. Відавочна, што гэтыя рэчы былі зроблены living рознымі майстрамі, пра што сведчаць некаторыя адрозненні ў выкананні, але тое, што майстры мелі агульны ўзор, не выклікае сумненняў. Існуе меркаванне, што міміка твару скульптуры з Асаўца можа суадносіцца з суворасцю і прыгнечанасцю, а твару з Дзяздзіцы – з суворасцю і жорсткасцю [11, с. 84], хаця, на наш погляд, гэта адзін і той жа твар, хоць і не выключна, што канкрэтны майстар ад сябе дадаваў нейкія асаблівасці вобразу. У любым выпадку падобныя інтэрпрэтацыі з’яўляюцца ўмоўнымі і суб’ектыўнымі.

Знаходку ў Дзяздзіцы лічаць жазлом чалавека з высокім сацыяльным статусам, аднак, магчыма, гэта быў не завершаны выраб, а нарыхтоўка для асобных антрапаморфных падвесак, прыкладам якой з’яўляецца знаходка з Асаўца. У дадзеным выпадку функцыянальная прыналежнасць знаходак не так істотна; галоўнае, што супадаюць выяўленчыя асаблівасці. Мастацкія прадметы Усвяцкай культуры маглі ствараца для разнастайных рытуальных дзеянняў, звязаных з ушанаваннем продкаў [11, с. 84].

Расійскі археолаг Андрэй Мазуркевіч адзначаў, што для неалітычна-энеалітычных разьбяных антрапаморфных выяў характэрна схематычнае выяўленне, пры гэтым рысы твара перадаюцца больш падрабязна, чым тулава [11,

с. 84]. Прыклады антрапаморфных скульптур з Асаўца пацвярджаюць гэтую асаблівасць. Між тым, той жа самы выяўленчы прынцып характэрны таксама і для іншых вядомых на тэрыторыі Беларусі дахрысціянскіх скульптур: акцэнт на твары (звычайна ў схематычным выкананні) пры ўмоўнай выяве (альбо нават адсутнасці) цела. З гэтага вынікае, што нягледзячы на розныя храналагічныя і этнакультурныя адрозненні і стылістычная змены, культавая дахрысціянская скульптура Беларусі захавала фундаментальны архаічны выяўленчы прынцып, што можа быць абумоўлена асаблівасцямі рэлігіі і міфалагічнага светапогляда.

Прапанаваная калектывам беларускіх даследчыкаў (Э. Ляўкоў, А. Карабанаў, Л. Дучыц, Э. Зайкоўскі, В. Вінакураў) класіфікацыя ідалаў, якія былі знойдзены на тэрыторыі Беларусі, таксама адлюстроўвае гэтую выяўленчую асаблівасць:

– асобныя каменныя галовы, якія ўстаўляліся ў драўляныя ці каменныя пастаменты. Гэта ідалы са Слоніма, вёскі Астрамечава Брэсцкага р-на, Шклова і інш.;

– фігуры, сярод якіх ёсць выразныя чалавекападобныя (вёска Богіна Браслаўскага р-на) і ў рознай ступені стылізаваныя формы (вёска Залуззе Жабінкаўскага раёна, Лепель, Чаплін каля Брэста, вёскі Юхнавічы Слонімскага, Хожава Маладзечанскага, Алізаравічы Рэчыцкага, Даўгінава Вілейскага, Буцькі Пружанскага р-наў і інш) [10, с. 65].

Праўда, наконт першай групы паўстаюць пэўныя пытанні: знойдзеныя каменныя галовы не абавязкова маглі ўсталёўвацца ў пастаменты. Не варта выключаць версію, што гэта могуць быць рэшткі разбітых стодаў у выглядзе слупоў, што вынікае з іх памераў і формы. Пра існаванне скульптуры ў форме слупа сведчаць захаваныя ідалы, а таксама слупавыя ямы на свяцілішчах (Верхаўлянскае, Хадосавіцкае і інш. [6, с. 225–226]), выяўленыя ў час раскопак, і пісьмовыя крыніцы: “балванъ естъ фалшывое подобенство то ест значачы то, чого правдиве немашъ, яко гды погане выставляли слупы Венере, або Менерве” [12, с. 56]. Беларускі тэрмін “стод” паходзіць з стараскандынаўскага stoð “слуп, калюмна” [6, с. 226]. Слупападобную форму можна вылучыць у якасці адной з выяўленчых асаблівасцяў тутэйшай паганскай скульптуры.

Асобнай праблемай з’яўляецца адлюстраванне твара скульптуры. З аднаго боку, вядомыя нам прыклады дэманструюць схематычнасць і нават прымітыўнасць у перадачы твара, з другога – асобныя стоды маюць галаву, але твар адсутнічае. Аднак у такіх выпадках незаўсёды можна дакладна вызначыць, ці першапачаткова не было твара, ці ён быў знішчаны пасля хрысціянізацыі. Напрыклад, ідал з в. Буцькі Пружанскага р-на, відавочна, мае твар, які, аднак захаваўся ў пашкоджаным выглядзе: заўважна, што яго імкнуліся сцерці. Пра Ваўкавыскі і Даўгінаўскі ідалы таксама можна меркаваць, што яны першапачаткова маглі мець твар, які пазней быў знішчаны, і мы не ведаем, якім ён быў, якая была ступень дакладнасці і дэталізацыі.

Агляд вядомых каменных ідалаў разам з апісаннямі тых, што не захаваліся да нашых часоў, дазваляе вылучыць яшчэ некалькі агульных характэрных прыкмет паганскіх ідалаў, якія паходзяць з тэрыторыі Беларусі:

– франтальнасць скульптуры, калі акрэсліваецца твар і пярэдні бок тулава, а бакі і задняя частка акрэслены ўмоўна, не маюць выяў, нярэдка з горшай апрацоўкай паверхні;

– тулава без дыферэнцыяцыі канечнасцяў, ці іх ўмоўнае акрэсліванне;

– галава фактычна не адасабляецца ад цела; шыя вылучаецца рэдка, часам, умоўна (ідал з. Буцькі Пружанскага р-на, Слонімскі ідал, Ваўкавыскі ідал, Лепельскі ідал, Кобрынскі ідал, ідал з в. Пярэспа Сенненскага р-на);

– статычнасць скульптуры, адсутнасць перадачы хоць якога руху.

Усе гэтыя характарыстыкі, хоць і маюцца прыклады-выключэнні, адносяцца да архаічных выяўленчых прыёмаў у скульптуры, але прасочваецца пэўная эвалюцыя форм. Аднак, з-за недастатковага масіва вядомых нам прыкладаў пакуль не ўяўляецца магчымым у поўнай ступені прасачыць гэтыя змены ў іх храналагічнай паслядоўнасці.

З шэрагу слупападобных ідалаў і каменнай скульптуры з умоўным тулавам вылучаюцца каменныя выявы крыжападобнай формы. На дадзены момант няма дакладнага разумення, ці з'яўляюцца антрапаморфныя крыжападобныя помнікі паганскімі стодамі (магчыма перарobленымі), ці ад пачатку гэта была своеасаблівая некананічная форма каменнага хрысціянскага крыжа?

На карысць таго, што падобныя помнікі з'яўляюцца крыжамі, могуць сведчыць наступныя аргументы: выразная крыжападобныя форма; антрапаморфныя рысы могуць быць мастацкім сродкам перадачы распяцця. Расійскія даследчыкі каменных крыжоў Аляксандр Патраўнаў і Таццяна Хмельнік сцвярджаюць, што крыжападобныя ідалы на тэрыторыі Беларусі – гэта насамрэч ад самага пачатку хрысціянскія каменныя крыжы, пра што, на іх думку, сведчыць нетыповасць формы для язычніцкай культавай скульптуры нашага рэгіёна, якая мае пераважна слупападобны выгляд ці форму асобнай галавы [13, с. 317]. Тут аўтары, відавочна, грунтуюцца на ўжо згаданай класіфікацыі паганскіх ідалаў, аднак ігнаруюць у ёй другую групу ідалаў, да якой беларускія даследчыкі адносяць і стоды крыжападобнай формы.

Прыведзеныя вышэй аргументы на карысць версіі пра каменныя крыжы аспрэчваюцца наступнымі тэзісамі: выразная антрапаморфная форма артэфактаў, часам наяўнасць твараў, што яскрава вылучаецца на фоне сотняў іншых вядомых каменных крыжоў; некалькі крыжападобных стодаў маюць прыкметы таго, што твар спрабавалі знішчыць, а гэта сведчыць пра тое, што яны не ўспрымаліся ў якасці хрысціянскіх крыжоў, іх пачатковая функцыя і сэнс былі зменены, аб чым сведчаць карэкціроўкі выгляда; традыцыя народнага ўшанавання асобных падобных помнікаў і іх інтэграцыя ў народныя каляндарна-абрадавыя практыкі; існаванне звычая ахвяравання ім; не з'яўляюцца надмагільнымі помнікамі, альбо трапілі на могілкі пазней у выніку пераносу.

На наш погляд, вядомыя ў Беларусі антрапаморфныя крыжападобныя помнікі, напрыклад, з в. Буцькі Пружанскага р-на, в. Даўгінава Вілейскага р-на, в. Грабаўцы Жабінкаўскага р-на, па сваім першапачатковым прызначэнні – гэта стоды. Ёсць падставы вылучыць асобны тып паганскай культавай скульптуры – ідалы крыжападобнай формы. Такі спосаб адлюстравання чалавека вядомы ў выяўленчым мастацтве дахрысціянскага перыяда (напрыклад, фігура на фрагменце неалітычнай керамікі, знойдзенай каля в. Юравічы Калінкавіцкага р-на), а сама форма крыжа даволі простая і тэхналагічна зручная для вырабу каменнай антрапаморфнай выявы.

Параўнанні з аналагамі з'яўляецца неабходным элементам даследавання падобных помнікаў, аднак нельга казаць пра тое, што ўсе вядомыя ідалы ў рэгіёне маюць толькі форму слупа ці асобнай галавы, як гэта сцвярджаюць асобныя аўтары. Калі як факт прызнаецца перыяд дваяверства і ўзаемаўплываў хрысціянства і паганства, то чаму не магло быць так, што пад уплывам новай веры з'явіўся прыкладна ў X–XIII стст. і новы тып антрапаморфных ідалаў крыжападобнай формы? Тым больш, што для тагачаснага праваслаўя культавая скульптура была нехарактэрная. У праваслаўнай традыцыі, у адрозненні ад каталіцтва, скульптура не набыла шырокага распаўсюджвання, бо яна ўспрымалася ў якасці праявы паганства (ідалаў). Замест аб'ёмнай пластыкі перавага аддавалася іканапісу, фрэскаваму

роспісу, плоскаму разьбярству. Багаслоў і гісторык царквы Філіп Шаф падкрэслівае, што ва Усходняй царкве выкарыстоўваюцца толькі каляровыя выявы на роўнай паверхні, а таксама мазаікі, у той час як скульптуры і статуі выключаны з дазволеных аб'ектаў пакланення. Рымская царква не робіць падобных абмежаванняў [16, с. 281]. Па гэтай прычыне падаецца малаверагодным з'яўленне хрысціянскага крыжа ў выглядзе аб'ёмнай антрапаморфнай фігуры. Вясковыя майстры не маглі ўбачыць падобных прыкладаў скульптуры ў царкве, каб пасля іх запазычыць, бо такіх тут проста не існавала (прынамсі на дадзены момант яны невядомы). Найбольш старыя ўзоры хрысціянскай скульптуры ў Беларусі, вядомыя сёння, адносяцца да канца XIV ст., а іх распаўсюджванне было звязана з пашырэннем каталіцтва на беларускіх землях. Пры гэтым, знаходкі крыжападобных ідалаў былі зроблены па-за рэгіёнамі першых каталіцкіх храмаў на тэрыторыі Беларусі, а стыль скульптуры не мае паралеляў з драўлянай гатычнай каталіцкай скульптурай, а значыць яна не магла быць крыніцай для запазычання. Такім чынам бачна, што гэта асобныя культурныя з'явы, якія не маюць паміж сабой генетычнай сувязі. І тут варта яшчэ нагадаць, што менавіта каменныя крыжы на беларускіх землях надзейна фіксуюцца з XVI ст. [15, с. 37–38], а ў гэты і наступныя перыяды мы не сустракаем аналагаў вядомым крыжападобным стодам, што таксама сведчыць пра іх больш старажытнае паходжанне ды існаванне ў іншым культурна-рэлігійным кантэксце.

Паганскі выяўленчы канон не быў адзіным і непарушным. Ён мог змяняцца ў часе і прасторы. Розныя формы ідалаў таксама могуць сведчыць пра розную культавую і этнакультурную спецыфіку. Некаторыя стоды маглі першапачаткова ствараецца менавіта крыжпадобнымі, а пасля яшчэ дадаткова апрацоўвацца, каб узмацніць абрысы крыжа. Адпаведна, такія помнікі могуць быць прыкладам перапляцення традыцый ды сведчаннем прыстасавання паганства да новых умоў, сродкам абыходу забароны ўшанавання ідалаў. Гэта можа быць праявай асобнай лакальнай традыцыі і сведчаннем працэсу хрысціянізацыі насельніцтва.

Сярод каменных крыжападобных стодаў вылучаецца невялікая група тыпалагічна блізкіх артэфактаў. Самым вядомым сярод іх з'яўляецца каменны ідал, які знаходзіўся паміж вёскамі Даўгінава і Жары Вілейскага р-на. Ідал крыжападобнай формы ўяўляе стылізаваную выяву жанчыны. Ён высечаны з шэрага гнейсавага валуна, злёгку кранутага выветрываннем. Вышыня яго 173 см, размах 107 см. Для такіх памераў ён занадта тонкі, каля 20–25 см. Верхні акруглы канец ўтварае галаву, папярочнікі падобныя на растаўленыя рукі. На іх узроўні ў сярэдзіне знаходзяцца два невялічкія выступы – грудзі. Яны трохі абабітыя з такім разлікам, каб замяніць іх невялікімі крыжовымі знакамі. Трохі ніжэй, на ўзроўні жывата знаходзіцца яшчэ адна пукатая фігура – дзіця. Яго форма паўтарае абрысы ўсёй скульптуры. Па ўсіх прыкметах гэта не крыж, а стод жаночага боства. На "спіне" ідала высечаны чатыры дванаццаціканцовых крыжа [9, с. 96–99].

Аналогіі з Даўгінаўскім ідалам мае антрапаморфная каменная выява са старых могілак у Кобрыне. Стод мае выразна акрэсленую шыю, галаву з вушамі, твар. Рукі адсутнічаюць, магчыма адбіты. На тулаве ўнізе прысутнічае рэльефная выява крыжа-дзіцяці, падобная на даўгінаўскую. Гэтая скульптура не захавалася і вядома толькі паводле малюнка ў кнізе мастацтвазнаўцы Міхаіла Кацара [7, с. 45, мал. 119].

На закінутых могілках ля в. Буйнавічы Лельчыцкага раёна быў выяўлены каменны крыж, які, імаверна, мог быць стодам падобнага тыпу. Фігура таксама апрацавана ў форме крыжа, але захавалася некранутай верхняя частка, якая мае акруглую форму, што стварае падабенства з галавой. На грудзі высечана рэльефная

выява дзіцяці (як і на Даўгінаўскім стодзе), пасярод галавы якога, падобна, высечаны маленькі крыжык.

Да гэтай групы таксама можна далучыць ідал з в. Грабаўцы Жабінкаўскага р-на. Ён мае крыжападобную форму памерамі 79×50×47 см., высечаны з камяня чырвона-попельнага колеру [3, с. 89]. Ідал мае добра акрэслены твар-авал, галаўны ўбор накшталт хусткі, пад падбародкам высечана крыжападобная фігура. Стод таксама суадносіцца з фігурай жанчыны.

Гэтыя ўзоры каменнай скульптуры, відавочна, звязаны з ушанаваннем багіні-маці. Сляды былых жаночых культаў, у тым ліку і ўшанаванне жаночых фігур-бостваў, захаваліся ў Беларусі да нашых дзён [8, с. 107]. Як бачна, тры антрапаморфныя крыжападобныя скульптуры аб'ядганы адзіным выразным элементам – меншая крыжападобаня антрапаморфная выява ў вобласці жывата (дзіця). Дадзеныя знаходкі зроблены ў розных рэгіёнах на даволі значнай адлегласці адна ад адной, што можа сведчыць пра параўнальна позні час іх стварэння, калі ранейшыя этнакультурныя адметнасці паступова ўніфікаваліся, у тым ліку пад уплывам хрысціянства, хаця, натуральна, вобраз багіні-маці добра вядомы і ў дахрысціянскай традыцыі. Гэта якраз можа быць сведчаннем прыстасавання паганства да новых умоў, прыкладам узаемаўплываў рэлігійных традыцый: шанаванне падобнай скульптуры было зручным і прыймальным як для паганцаў, так і для першых пакаленняў ахрышчаных людзей. Праз крыжападобную форму адбывалася наступнае развіццё выяўленчага канона культавай дахрысціянскай скульптуры: выразная дыферэнцыяцыя канечнасцяў (рук), паступовае адасабленне галавы ад тулава, вылучэнне шыі. Аднак наступнае развіццё выяўленчых формаў было перарванае заняпадам паганства праз страту статуса інстытуцыянальнай рэлігіі і дамінуючае становішча хрысціянства ў якасці афіцыйнай дзяржаўнай рэлігіі.

У цэлым згаджаючыся з існуючай сёння класіфікацыяй культавай дахрысціянскай скульптуры, якая паходзіць з тэрыторыі сучаснай Беларусі, лічым неабходным яе ўдакладніць з улікам адзначаных акалічнасцяў. Адпаведна, класіфікацыя ідалаў, паводле іх формы, можа быць прадстаўлена наступным чынам:

– ідалы слупападобнай формы (ідал з в. Пярэспа Сенненскага р-на, "Цар Давыд" блізу в. Слабодка Смалявіцкага р-на, Ваўкавыскі ідал і інш.);

– асобныя каменныя галовы, якія ўстаўляліся ў драўляныя ці каменныя пастаменты (Слонімскі ідал, Шклоўскі ідал, ідал з в. Астрамечава Брэсцкага р-на і інш.);

– фігуры, сярод якіх ёсць выразныя чалавекападобныя і ў рознай ступені стылізаваныя формы (ідалы з Лепельскага р-на, в. Богіна Браслаўскага р-на, в. Залуззе Жабінкаўскага р-на і інш.);

– ідалы крыжападобнай формы з выразнымі антрапаморфнымі рысамі (ідалы з. Буцькі Пружанскага р-на, в. Даўгінава Вілейскага р-на, в. Грабаўцы Жабінкаўскага р-на і інш.).

Такі пералік відаў ідалаў у пэўнай ступені таксама адлюстроўвае працэс эвалюцыі выяўленчага канона паганскай скульптуры на беларускіх землях у храналагічнай паслядоўнасці.

Нягледзячы на немагчымасць на дадзены момант вылучыць выяўленчыя каноны дахрысціянскай скульптуры асобных этнакультурных супольнасцяў на тэрыторыі Беларусі, што абумоўлена малой колькасцю вядомых артэфактаў, аналіз дазваляе вылучыць адметныя рысы дахрысціянскай скульптуры ўвогуле:

– захаванне ў скульптуры ад часоў неаліта да сярэднявечча архаічнага выяўленчага прынцыпа, які выяўляецца ў схематычнасці і прымітыўнасці ў перадачы антрапаморфнага вобраза, акцэнтаванні ўвагі на твары (галаве), рысы якога перадаюцца больш падрабязна, чым тулава;

– схематычнасць у выкананні твара;

– адсутнасць альбо схематычнае ўмоўнае адлюстраванне цела;

– франтальнасць скульптуры, калі акрэсліваецца твар і пярэдні бок тулава, а бакавыя паверхні і задняя частка акрэслены ўмоўна, не маюць выяў, нярэдка з горшай апрацоўкай паверхні;

– галава фактычна не адасабляецца ад цела; шыя вылучаецца рэдка, часам, умоўна;

– тулава без дыферэнцыяцыі канечнасцяў: толькі ў скульптуры крыжпадобнай формы вылучаюцца рукі ў выглядзе гарызантальнай папярочыны, а ў ніжняй частцы канечнасці (ногі) так і не былі вылучаны, відаць таму, што з-за ўкопвання ў зямлю ці ўсталявання ў нейкія магчымыя пастаменты, у адлюстраванні ног не было патрэбы;

– статычнасць скульптуры, адсутнасць перадачы хоць якога руху.

Пералічаныя асаблівасці сведчаць пра кансерватыўнасць выяўленчага канона культавай дахрысціянскай скульптуры на тэрыторыі Беларусі незалежна ад часу і этнакультурнай прыналежнасці канкрэтных артэфактаў. Скульптура праз неглыбокую ступень прапрацоўкі і ўмоўнасць антрапаморфнага вобраза недалёка адыходзіць ад пачатковай прыроднай нарыхтоўкі. І гэта цікавы момант, які яшчэ патрабуе свайго асэнсавання. Гэта складана патлумачыць нібыта прымітыўнасцю тэхналогій і мастацкіх навыкаў, бо мы ведаем сінхронныя ўзоры скульптуры ў выглядзе жывёл і птушак, а таксама упрыгожванні ды іншыя разнастайныя рамесныя вырабы, якія маюць добрую якасць выканання і сведчаць пра даволі развіты мастацкі густ і стыль. Прычыны архаічнай схематычнасці антрапаморфнай скульптуры трэба шукаць у асаблівасцях рэлігійнага светапогляда насельніцтва беларускіх земляў, існаваўшых уяўленняў пра багоў і навакольны свет. Пра шанаванне прыроды, як адметную рысу тутэйшых паганскіх культаў, пісалі многія аўтары ад часоў сярэднявечча да нашых дзён. Гэтая з’ява беларускай традыцыйнай культуры добра апісана этнографамі XIX – XX ст., і нават у нашы дні беларусам уласцівы культ святых камянёў, крыніц, дрэў ды іншых прыродных аб’ектаў. Магчыма, што і ў старажытнасці асноўная ўвага надавалася менавіта ўшанаванню прыроды, багоў праз прыродныя аб’екты, а не праз штучна створаныя ідалы і свяцілішчы. То бок не было рэлігійнай патрэбы ў стварэнні дасканалай антрапаморфнай культавай скульптуры. Гэтым можна спрабаваць патлумачыць, чаму тут ідалы былі простымі, без падрабязнай дэталізацыі, не адлюстроўвалі дакладна чалавека і таму былі бліжэй да свайго прыроднага зыходніка.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі / Э.М. Зайкоўскі, У.Ф. Ісаенка, А.Г. Калечыц [і інш.]; пад рэд. М.М. Чарняўскага, А.Г. Калечыц. – Мінск : Бел. навука, 1997. – 424 с.

2. Беспалова, Т. И., Микляев, А. М. О работах в Псковской области / Т. И. Беспалова, А. М. Микляев и др. // Археологические открытия 1976 года. – Москва: Наука, 1977. – С. 7–8.

3. Дучыц, Л. У. Звесткі аб язычніцкіх ідалах на тэрыторыі Беларусі / Л. Дучыц // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1990. – №6. – С. 87–91.

4. Дучыц, Л.У., Зайкоўскі, Э.М. Ідалы / Л. У. Дучыц, Э. М. Зайкоўскі // Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. – Мінск : Беларусь, 2006. – С. 204–205.

5. Забашта, Р. Язичницька монументальна скульптура Білорусії (Контекстуальні паралелі й зближення) / Р. Забашта // Беларусь у сістэме трансеўрапейскіх сувязяў у I тыс. н. э. Тэзісы дакладаў і паведамленняў міжнароднай канферэнцыі. – Мінск : НВП “Ваўкалака”, 1996. – С. 33 – 35.

6. Зайкоўскі, Э. Капішча / Э. Зайкоўскі // Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. – Мінск : Беларусь, 2006. – С. 225–226.

7. Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1996. – 208 с.

8. Лобачевская, О. А. Женские антропоморфные кресты на Беларуси: современные наблюдения и гипотезы / О. А. Лобачевская // Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур Беларусі. – Мінск : Беларускі дзяржаўны ун-т культуры, 2008. – С. 94–109.

9. Ляўкоў, Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э. А. Ляўкоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 213 с.

10. Ляўкоў, Э., Карабанаў, А., Дучыц, Л., Зайкоўскі, Э., Вінакураў, В. Культавыя камяні Беларусі / Э. Ляўкоў, А. Карабанаў, Л. Дучыц, Э. Зайкоўскі, В. Вінакураў // З глыбі вякоў. Наш край: Гіст.-культуралаг. зб. Вып. 2. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – С. 47–68.

11. Мазуркевич, А.Н. Художественное творчество древнего населения северо-запада России / А. Н. Мазуркевич // Зверь и человек. Древнее изобразительное творчество Евразии. – СПб: Государственный Эрмитаж, 2009. – С. 79–87.

12. Мальдзіс А.І., Крамко І.І. Невядомы помнік палемічнай літаратуры XVII ст. (“О образех, о реликвях”) / А. І Мальдзіс, І. І. Крамко // Беларуская лінгвістыка. – 1983. – Вып. 24. – С. 57–61.

13. Потравнов, А.Л., Хмельник, Т.Ю. Безмолвные стражи прошлого. Монументальные каменные кресты / А.Л. Потравнов, Т.Ю. Хмельник. – М.: Вече, 2018. – 368 с.

14. Скварчэўскі, Зм. Паганскія ідалы на тэрыторыі Беларусі / Зм. Скварчэўскі // Siver. – 2013. - №1. – С. 68 – 83.

15. Скварчэўскі, Д.В. Крыж альбо чалавек? Да пытання пра семантыку знакаў на вясковых надмагіллях XV–XIX стст. на тэрыторыі Беларусі / Д.В. Скварчэўскі // Таинственная Беларусь VI: материалы конференции (г. Минск, 14 марта 2020 года). – Минск : Регистр, 2020. – С. 35–53.

16. Шафф, Ф. История христианской церкви. Том IV. Средневековое христианство. От Григория I до Григория VII. 590–1073 г. по Р. Х. / Филип Шафф. – СПб.: Библия для всех, 2008. – 511 с.

## ЯЗЫК БОГОСЛУЖЕНИЯ В ХРИСТИАНСКОЙ ПРАКТИКЕ БЕЛОРУСОВ

**А. В. Верещагина (Гурко)**

Минск, Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН РБ, ver-aliaksandra@yandex.ru

Автор показывает, что вплоть до начала XX века религиозный фактор влиял на этническую картину белорусских земель. Формирование многоконфессиональной структуры белорусского общества повлияло на процесс формирования этнической идентичности белорусов. Белорусские